ЧАСАПІСЬ
БЕЛАРУСКАГА НАЦЫЯНАЛЬНА — СЬВЯДОМАГА СТУДЭНЦТВА № 6 за 1989 год

Студэнцкая думка

ВЫДАНЬНЕ КАНФЭДЭРАЦЫІ БЕЛАРУСКІХ СУПОЛАК КБС — БНФ «АДРАДЖЭНЬНЕ»

БЕЛАРУСКІ СТУДЭНЦКІ САЮЗ ЦІ КАНФЭДЭРАЦЫЯ БЕЛАРУСКІХ СТУДЭНЦКІХ ЗГУРТАВАНЬНЯЎ?..

СЯБРЫ !!!

Усім нам відавочная неабходнасьць стварэньня незалежнае студэнцкае арганізацыі. Ідэю гэтую заўсёды падтрымлівала рэдакцыя "Студэнцкае Думкі". Мы атрымалі праект праграмы Канфэдэрацыі Беларускіх Студэнцкіх Згуртаваньняў, якію прапануе стварыць група студэнтаў з шэрагу менскіх інстытутаў: педагагічнага, політэхнічнага і тэхналягічнага. Мы ўхваляем запрапанаваны праект, але маем поўны сумнеў наконт канфэдэрацыйнае будовы будучае арганізацыі. Ці здолее гэткая нетрывалая структура, як канфэдэрацыя, пасьпяхова вырашаць усе студэнцкія праблемы? Ніжэй мы зьмяшчаем запрапанаваны праект і заклікаем усіх зацікаўленых студэнтаў уключыцца ў ягонае абмеркаваньне. Актыўнае спрычыненьне кожнага з Вас да справы распрацоўкі праграмы будучае арганізацыі дазволіць усім нам падыйсьці да новага навучальнага года з грунтоўна падрыхтаваным дакумантам. Вакол гэтага дакуманта мусе затым згуртавацца студэнцкая моладзь. Прапановы, парады, заўвагі па дадзенаму праекту, а таксама свае ўласныя распрацоўкі праграмы просім дасылаць на адрас рэдакцыі. Нагадваем, што адрас рэдакцыі "С.Д." зьмешчаны на апошняй старонцы нашае часапісі. ЖЫВЕ БЕЛАРУСКІ СТУДЭНЦКІ РУХ !!!

Рэдакцыя "Студэнцкае Думкі".

* * *

Сёньняшні момант патрабуе стварэньня спэцыфічнае студэнцкае арганізацыі дзеля рашэньня ўласна студэнцкіх і агульнаграмадзкіх задачаў.

Такая арганізацыя, відаць, павінна ўяўляць сабою канфэдэрацыю самастойных адзінак, якія ствараюцца па тэрытарыяльнай — па вышэйшых школах, а таксама па палітычнай прыкмеце. У канфэдэрацыю могуць уваходзіць вытворчыя кааператывы, пэрсанал якіх складаецца са студэнтаў і выкладчыкаў.

МЭТЫ КАНФЭДЭРАЦЫІ:
/праект/

1. Забесьпячэньне палітычнага волявыяўленьня студэнцтва на прынцыпах палітычнага плюралізму;
2. Усталяваньне дэмакратычнай і дынамічнай сыстэмы самакіраваньня вышэйшае школы;
3. Забесьпячэньне матар'яльных патрэбаў студэнцтва.

ЗАДАЧЫ КАНФЭДЭРАЦЫІ:

I.

— студэнты ў межах канфэдэрацыі вольна арганізуюцца ў палітычныя рухі і арганізацыі ў залежнасьці ад сваіх перакананьняў;
— канфэдэрацыя вядзе барацьбу за стварэньне прававое дзяржавы;
— стварэньне на тэрыторыі Беларусі экалягічна чыстае, бязьядзернае зоны;
— адраджэньне суладных міжнацыянальных узаемадачыненьняў на падставе прыярытэтнасьці нацыянальнае мовы карэннага насельніцтва краю;
— экстэрытарыяльнасьць ВНУ. Падразьдзяленьням паліцыі і войскаў забараняецца знаходзіцца на тэрыторыі ВНУ без дазволу рады ВНУ;
— на тэрыторыі ВНУ мітынгі і сходы адбываюцца з паведамленьнем рады ВНУ;
— вольнае, бесцэнзурнае выданьне і распаўсюджваньне на тэрыторыі ВНУ ўласных друкаваных органаў арганізацыяў — сяброў канфэдэрацыі;
— вылучэньне ўласных кандыдатаў на выбарах у мясцовыя й вярхоўныя органы ўлады.

2.

— выбарнасьць усіх органаў унутранага самакіраваньня ВНУ;
— прадстаўніцтва студэнцтва ў іх ня менш за палову агульнага складу;
— аўтаномія ВНУ, гэта значыць, што ВНУ самастойна па рэкамэндацыях адпаведных ведамстваў выпрацоўвае навучальныя пляны і праграмы, якія зацьвярджаюцца органамі самакіраваньня;
— рэктар, прарэктары, дэканы і загадчыкі катэдраў абіраюцца па прадстаўленьні катэдраў студэнцка-выкладчыцкімі канфэрэнцыямі і перыядычна трымаюць перад імі справаздачы;
— магчымасьць выбарнасьці выкладчыкаў для навучаньня;
— скасаваньне сэмэстравае сыстэмы навучаньня;
— узнаўленьне статусу вольнага слухача;
— дэмілітарызацыя навучаньня ў ВНУ:
а/ вольнае наведваньне заняткаў на вайсковых катэдрах для тых, хто адбыў тэрміновую вайсковую службу;
б/ пры знаходжаньні студэнта ў акадэмічным адпачынку ён ня можа быць заклікан у шэрагі СВ;
в/ навучаньне дысцыплінам якія прадугледжваюць атрыманьне вайсковай спэцыяльнасьці — і як вынік — вайсковага білету адбываецца на прынцыпах дабраахвотнасьці і па жаданьні замяняецца спэцкурсамі грамадзянскае скіраванасьці;
г/ выпускнікі ВНУ пад час праходжаньня службы ў войску працуюць непасрэдна па сваёй спэцыяльнасьці. Кантроль за гэтым вядзецца вайсковай радай ВНУ. Служба праходзіць на тэрыторыі рэспублікі.
д/ замена службы ў войску працоўнай павінна сьцю для асобаў, якія з рэлігійных перакананьняў ня могуць адбываць службу ў войску;
— вольнае наведваньне лекцыяў;
— увядзеньне дзьвюх /ды болей/ плынных сыстэмы навучаньня;
— дэмакратызацыя прапускова сыстэмы ў інтэрнатах.

3.

— забесьпячэньне кожнага студэнта стыпэндыяй і жыльлём;
— кантроль радай факультэту разьмеркаваньня стыпэндыяў, жыльля, а таксама разьмеркаваньня на працу пасьля сканчэньня ВНУ;
— аплочваньне любой працы студэнтаў;
— дабраахвотнасьць удзелу студэнтаў у с/гас. працах, ДНД, суботніках;
— усталяваньне круглагодняга льготнага праезду на ўсе кшталты транспарту на Беларусі.

Гурт студэнтаў з політэхнічнага, педагагічнага і тэхналягічнага інстытутаў Менску.

ПАЛЯК? РУСКІ? МОЖА БЕЛАРУС?...

Мінула старадаўняе беларускае народнае сьвята ВЯЛІКДЗЕНЬ. Адзначаюць яго беларусы двойчы. А называюць - чамусьці - адзін "рускім", а другі "польскім" Вялікаднём. Мала таго. Досыць часта даводзіцца чуць выразы "руская" вера і "польская" вера, прычым ужываюцца гэтыя выразы ў дачыненьні да беларусаў. Часам і самыя беларусы называюць сябе "рускімі" або "палякамі" ў залежнасьці ад сваёй веры ці веры сваіх продкаў. Тэй, хто гэтак думае ці кажа, робіць найвялікшую памылку. Менавіта гэтага - расколу нашага народу па рэлігійнай прыкмеце - і дамагаліся нашыя ворагі.

Хрысьціянская вера напачатку нашага стагодзьдзя падзялілася на дзьве галіны — каталіцкую /заходнюю/ і праваслаўную /усходнюю/. Сталася гэтак, што ў эпоху незалежнага існаваньня Беларускае дзяржавы ў нас мірна суіснавалі і праваслаўе, і каталіцтва, і пратэстантызм. Прычым казані ў сьвятынях гаварыліся па-беларуску. А вось калі Беларуская дзяржава пачала занепадаць, тут суседзі — каталікі-палякі і праваслаўныя-расейцы — скарысталі наяўнасьць некалькіх хрысьціянскіх рэлігіяў на Беларусі, каб раска[illegible]оць наш народ.

У XУ стагодзьдзі бе[illegible]арусы стварылі Уніяцкую рэлігію /сынтэз праваслаўя з каталіцтвам/, якая стала нацыянальнаю: бо[illegible]ьшасьць беларускіх сялян у XIX ст. вызнавала Ун[illegible]ацтва, [illegible]покуль у 1839 годзе пры дапамозе каза[illegible] іх шабляў іх не перавярнулі ў праваслаўе. Та[illegible] ўжо праваслаўная царква стала магутнаю зброяй [illegible]амадзяржаўя і русіфікацыі. Палякі ж, асабліва ез[illegible]ты /гэты ордэн быў забаронены паўсюль, апро[illegible] [illegible]сейскай імпэрыі/, апанавалі каталіцкую царк[illegible] пры дапамозе якой апаля[illegible]чвалі беларускі нар[illegible] [illegible]ітыка і прывяла неўзаба-

Гэткая рэлігійная [illegible] ве да таго, што бела[illegible] [illegible]-каталікі пачалі называць сябе "палякамі [illegible] ы жывуць зараз на Гарадзеншчыне і Меншчык[illegible] [illegible]аста ня ўмеюць зусім па-польску/, а беларусі[illegible] [illegible]васлаўныя сталі лічыцца "рускімі".

Але ці можа вера [illegible]ачаць нацыянальнасьць ?

Напрыклад, палякі [illegible]ць каталіцкай і кальвінісцкай веры; немцы [illegible]ь каталікі, лютэране і кальвіны, але і паля[illegible] і немцы складаюць адзін народ: адны польскі [illegible]угі нямецкі.

Усе беларусы, нез[illegible]а ад веравызнаньня, роўныя дзеці аднэй матк[illegible] БЕЛАРУСІ. Бо нарадзіліся мы беларусамі, а ве[illegible]ючымі ці няверуючымі робімся потым.

І таму ўсе мы — і [illegible]эісты, і каталікі, і праваслаўныя — павінны ра[illegible]ам стаяць за лепшую будучыню ўсяго нашага нар[illegible]ду і краю.

СЛУХАЙМА!!!

РАДЫЁ ВАТЫКАН

Беларуская Сэкцыя Ватыканскага Радыё існуе амаль 40 гадоў. Першыя пробныя праграмы пачаліся ў 1949 годзе. Сёньня беларускія праграмы перадаюцца кожнага дня, з паўтарэньнем раніцай наступнага дня. Кожная праграма трывае 15 хвілін. Заснавальнікам беларускае радыё-праграмы быў айцец Пётра Татарыновіч /1896 - 1978/, які праз доўгі час вёў праграмы сам. Цяперака праграма мае 3 сталых працаўнікоў, ня лічачы вонкавых супрацоўнікаў.

Беручы пад увагу сучаснае становішча Царквы на Беларусі, у асаблівасьці недахоп сьвятароў, перадачы Ватыканскага Радыё набіраюць асаблівага значэньня. Для многіх гэта ёсьць бадай адзіны спосаб атрымаць нейкія рэлігійныя веды. Дзеля гэтага Беларуская Сэкцыя Ватыканскага Радыё большую частку свайго часу прысьвячае праграмам рэлігійнага зьместу/навучаньне праўды веры, гутаркі на рэлігійныя ды маральныя тэматы, Літургічныя тэксты і г.д./. Адначасова паводле магчымасьці падаюцца праграмы на культуралягічныя тэматы, з асаблівасьцю ўвагаю на хрысьціянскія карані беларускае культуры.

Апрача вышэйузгаданых тэматаў Беларуская Сэкцыя, як усе іншыя Сэкцыі Ватыканскага Радыё, перадае рэгулярна весткі з рэлігійнага жыцьця і дзейнасьці Сьвятога Айца. Такім чынам для многіх беларускіх слухачоў Беларуская Праграма зьяўляецца лучнікам з Сусьветнаю Царквою.

Малітва за Беларускі Народ

Сусьветны Валадару, Прадвечны Божа, Ты ўвесь сусьвет стварыў і законы для яго ўстанавіў, кожнаму месца і мэту назначыў, а людзкі род так бясконца палюбіў, што Сына Свайго Адзінароднага паслаў на зямлю, каб усе слухаючы Яго навуку ды ідучы Ягоным сьледам, увайшлі ў Тваё Нябеснае Валадарства. Мы дзеці Беларускага Народу, як маглі слухаліся Тваіх загадаў, але з слабасьці чалавечае часта падалі, і зьневажалі Цябе сваімі грахамі. Цяпер молім Цябе шчыра: даруй нам нашы грэшныя правіны, нашую нядбайлівасьць у адносінах да сябе самых і да іншых; даруй таксама тым, хто нас крыўдзіў і зьневажаў. Молім Цябе шчыра, барані нас ад крыўды варожай, і дай нам ды ворагам нашым шчодраю Твае рукою, духа сапраўднае хрысьціянскае любові. Дай нам еднасьць у веры, згоду ў радзінным і грамадзкім ды палітычным жыцьці. Загаі нашы асабістыя і ўсенародныя раны душы, якія мы самі сабе спрычынілі. У нашым штодзённым жыцьці, у змаганьнях і спакусах, асьвяці наш разум Тваім евангельскім сьвятлом, каб мы захоўваючы Твае прыказаньні, перамаглі ўсе цяжкасьці і цярпеньні, ды заўсёды Цябе благаславілі. Пашлі Беларускаму Народу сьвятых і вялікіх слугаў сваіх, якія праведным, чэсным і мудрым жыцьцём і дзейнасьцю вялі-б Народ да лепшае долі. Дай нам сьвятое духавенства. Благаславі нашыя радзіны, каб у кожнай зь іх дбалы бацька і ахвярная маці, злучаныя шчыраю сьвятою любоўю, выхоўвалі Табе на славу, Бацькаўшчыне на карысьць сваіх дзетак. Асаблівую ласку дай нашай моладзі, каб яна атрымала глыбокае хрысьціянскае ўзгадаваньне, і ўзрасла на карысьць сыноў і дачок свайго народу.

Благаславі таксама нашы дачасныя дастаткі, ня дай гінуць марна тым талентам, якія Ты ссылаеш у наш народ, але дай ім свабодна разьвіцца і закрасаваць Табе на славу, а ўсяму людзтву на карысьць. Благаславі працам сялянства на ральлі, працоўным на фабрыках, навукоўцам ва ўсіх галінах навукі, мастацтва і тэхнікі, каб за іх помаччу Беларускі Народ мог разумна і прыгожа жыць ды разьвівацца.

Цябе, Найсьвятая Багародзіца і нашая нябесная Маці, просім: прычыніся за намі, а Ты сьвятая Эўфрасіня Полацкая — патронка Беларусі — ды ўсе сьвятыя заступнікі Беларускага Народу, апякуйцеся намі, каб мы сталіся народам сьвятым, выконваючым Волю Божую і сваё пасланьніцтва, каб прычыніліся да агульнага дабра тут на зямлі, а ў будучым жыцьці атрымалі вечнае шчасьце, і Табе прадвечнаму Валадару, прыносілі славу, чэсьць і паклон на векі вечныя. Амін.

Ларыса Геніюш

Зь невядомае паэзіі

* * *

Лучнасьць з Табою, як шчасьця прыліў,
Умацаваньне нязломнае сілы.
Адзінокай вярбою стаю сярод ніў,
Неба сонцам мяне атуліла.

* * *

Нехта зло нам рыхтуе, хтось брудам абліў,
Толькі вера ў Цябе не астыла.
Адзінокай вярбою стаю сярод ніў,
Неба сонцам мяне атуліла.

* * *

Час на Беларусі	Праграма	Перыядычнасьць	Хвалі
07.45	Беларуская праграма	Штодня	41 м. 31 м. 25 м.
10.15	Літургія з украінскім казаньнем	Штонядзелі	31 м. 25 м. 19 м. с.х.
20.45	Беларуская праграма	Штодня	49 м. 31 м. 25 м. с.х.

УВАГА!

Ідзе збор подпісаў...

Сябры !

Рэдакцыя "Студэнцкае Думкі" падрыхтавала і распачала збор подпісаў пад лістом пратэсту супроць прынятага Вярхоўнай Радай Беларусі антыдэмакратычнага"Указу," які ганьбуе сьвятыні беларускага народу — беларускую нацыянальную сымболіку, які абмяжоўвае законныя правы грамадзянаў у пашырэньні інфармацыі, які супярэчыць Сусьветнай Дэкларацыі правоў чалавека і Канстытуцыі нашае краіны.

Заклікае Вас !

Шырака праводзіць збор подпісаў пад гэтым лістом у сваіх студэнцкіх групах, сярод сваі знаёмых, сяброў і сваякоў. Для гэтага на чыстым аркушы паперы трэба напісаць зьверху: "Пратэстуем супроць Указа Прэзыдыума ВС БССР ад 31.03.1989г. -- арт. 167^2, арт. 172". Збор подпісаў трэба праводзіць у трох асобніках/экзэмплярах/, пазначаць мейсца працы, навучаньня альбо мейсца жыхарства. Просьба дасылаць лісты з сабранымі подпісамі на адрас Рэдакцыі "Студэнцкае Думкі" з паведамленьнямі пра ўручэньне. Нагадваем Вам, што адрас Рэдакцыі падаецца на старонцы 8 нашае часапісі.

* * *

Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету СССР
Прэзыдыюм Вярхоўнага Савету БССР
Камісыя ААН па правах чалавека
Пасольства Злучаных Штатаў Амэрыкі
Пасольства Фэдэратыўнае Рэспублікі Германіі
Рэдакцыя газэты "Правда"
Рэдакцыя газэты "Известия"
Рэдакцыя газэты "Труд"
Рэдакцыя газэты "Вячэрні Мінск"
Рэдакцыя газэты "Чырвоная змена"
Рэдакцыя газэты "Советская Белоруссия"
Рэдакцыя газэты "Літаратура і мастацтва"

Доўгі час Беларуская ССР лічылася /і цяпер кіраўніцтва рэспублікі прыкладае ўсе намаганьні,каб лічылася і надалей/ самай пасьпяховай і забясьпечанай рэспублікай. Пачаткам крушэньня гэтай ілюзіі былі падзеі 30-га кастрычніка 1988 году, калі тысячы і тысячы людзей сабраліся на Дзень памяці продкаў. Яны йшлі на магілы сваякоў, ішлі да мейсца, дзе ў часы сталінскіх рэпрэсыяў былі зьнішчаныя дзесяткі тысячаў ні ў чым не вінаватых людзей. Яны йшлі ўшанаваць памяць. Ішлі з кветкамі... Іх сустрэлі вайсковыя задамёты. Іх сустрэлі міліцыя і спэцпадразьдзяленьні з дубінкамі . Іх сустрэлі сьлезацечным газам. У афіцыйных справаздачах камісыі, створанай для разбору, пра гэта нічога не сказана. Але гэта было. Было ўжываньне грубае фізычнай сілы, брыдкай лаянкі, газаў. Было абяцаньне ўчыніць другія Курапаты.

Пасьля гэтае акцыі, у сувязі з вялікай падтрымкай насельніцтвам Беларускага Народнага Фронту /правядзеньне шматтысячных мітынгаў,амаль імгненнае зьнікненьне "Навінаў Беларускага Народнага Фронту", якія чытаюць усе - ад школьнікаў да 80-гадовых бабулек/, пасьля адмовы мяйсцовымі ўладамі правядзеньня Вальнага Сойму краязнаўчых,экалягічных ды іншых патрыятычных клюбаў цяперашняе рэспубліканскае кіраўніцтва атрымала вотум недаверу. Ні першы сакратар ЦК КПБ Сакалоў, ні Старшыня Прэзыдыума Вярхоўнага Савету БССР Таразевіч,ні Старшыня Савету Міністраў Кавалёў кават не рызыкнулі выставіць свае кандыдатуры на выбарах народных дэпутатаў СССР у сталіцы рэспублікі горадзе Менску і выставілі іх без канкурэнцыі ў розных вясковых раёнах рэспублікі.

Адзіны, хто адважыўся балатавацца ў Менску, — першы сакратар гаркама -- набраў 13% галасоў. Нам вядома пра ціск з боку райкамаў на выбаршчыкаў. Пра палітыку ў дачыненьні да БНФ сьведчаць дакумэнты, змешчаныя ў наступных самвыдавецкіх выданьнях: "Кантакт", №I,/с.9, "Дакумент II" ды с. 10, "Дакумент III"/, "Супольнасьць",№2./с. 6, "Карэспандэнты паведамілі"/.

Пра гэта гаворыць той факт, што ноччу, безь неабходных на тое санкцыяў быў узламаны адзін з пакояў у Доме літаратара і арыштавана 10 тысячаў асобнікаў бюлетэня "Навіны Народнага Фронту"; той факт, што антызаконна спынена прыняцьце грошай на рахунак БНФ, выпісаны на імя П.Садоўскага.

І вось пасьля ўсяго гэтага, не выносячы на ўсенароднае абмеркаваньне, не чакаючы зьезду народных дэпутатаў Прэзыдыум Вярхоўнага Савету БССР прыняў 31.03.1989г. "Указ":

Кодэкс дапоўнены новым артыкулам 167^2 наступнага зместу:

«Артыкул 167^2. Незаконнае карыстанне флагамі і вымпеламі, выраб, распаўсюджванне або нашэнне плакатаў, эмблем і сімвалаў.

Карыстанне ў грамадскіх месцах флагамі і вымпеламі, не зарэгістраванымі ва ўстаноўленым парадку, а таксама выраб, распаўсюджанне або нашэнне плакатаў, эмблем і сімвалаў, змест якіх накіраваны на нанясенне шкоды дзяржаўнаму і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян, —

вядзе да папярэджання або накладання штрафу на грамадзян у памеры да пяцідзесяці рублёў і папярэджання або накладання штрафу на службовых асоб — да ста рублёў з канфіскацыяй гэтых прадметаў».

З мэтай навядзення парадку ў выкарыстанні размнажальнай тэхнікі, выкананні правіл выпуску друкаваных выданняў і іх распаўсюджвання ўнесены дапаўненні ў артыкул 172. Рэдакцыя гэтага артыкула такая:

«Артыкул 172. Парушэнне правіл адкрыцця паліграфічных і штэмпельна-гравёрных прадпрыемстваў, набыцця, збыту, выкарыстання, уліку і захоўвання размнажальнай тэхнікі. Незаконнае распаўсюджванне друкаваных выданняў.

Парушэнне службовымі асобамі правіл адкрыцця паліграфічных і штэмпельна-гравёрных прадпрыемстваў, набыцця і збыту паліграфічнага абсталявання, размнажальных апаратаў, шрыфтоў і матрыц, —

вядзе да накладання штрафу ў памеры да ста рублёў.

Парушэнне правіл выкарыстання, уліку і захоўвання паліграфічнага абсталявання, размнажальных апаратаў, шрыфтоў і матрыц асобамі, адказнымі за выкананне гэтых правіл, —

вядзе да спагнання штрафу ў памеры да пяцідзесяці рублёў.

Распаўсюджванне друкаваных выданняў, што выраблены з парушэннем устаноўленага парадку і не маюць выпускных даных, змест якіх накіраваны на нанясенне шкоды дзяржаўнаму і грамадскаму парадку, правам і законным інтарэсам грамадзян, —

вядзе да папярэджання або накладання штрафу ў памеры да пяцідзесяці рублёў з канфіскацыяй гэтых выданняў».

Гэтыя артыкулы супярэчаць артыкулу 50, артыкулу 51 Асноўнага закона Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік, дзе сказана:

Артыкул 50. У адпаведнасці з інтарэсамі народа і ў мэтах умацавання і развіцця сацыялістычнага ладу грамадзянам СССР гарантуюцца свабоды: слова, друку, сходаў, мітынгаў, вулічных шэсцяў і дэманстрацый.

Ажыццяўленне гэтых палітычных свабод забяспечваецца прадастаўленнем працоўным і іх арганізацыям грамадскіх будынкаў, вуліц і плошчаў, шырокім распаўсюджваннем інфармацыі, магчымасцю выкарыстання друку, тэлебачання і радыё.

Артыкул 51. У адпаведнасці з мэтамі камуністычнага будаўніцтва грамадзяне СССР маюць права аб'ядноўвацца ў грамадскія арганізацыі, якія садзейнічаюць развіццю палітычнай актыўнасці і самадзейнасці, задавальненню іх разнастайных інтарэсаў.

Грамадскім арганізацыям гарантуюцца ўмовы для паспяховага выканання імі сваіх статутных задач.

Яны супярэчаць і артыкулам №№ 2;19;20 Сусьветнае Дэкларацыі правоў чалавека.

Артыкул 2. Кожны чалавек павінен мець усе правы і ўсе свабоды, абвешчаныя гэтай Дэкларацыяй, незалежна ад расы, колеру скуры, полу, роду, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананьняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжаньня, маёмаснага, станавага або іншага палажэньня.

Апрача таго, не павінна праводзіцца ніякае розьніцы на аснове палітычнага, праўнага або міжнароднага статусу краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незалежна ад таго, ці гэтая тэрыторыя незалежная, падапечная, несамакіраўнічная, або як-небудзь інакш абмежаваная ў сваім суверэнітэце.

Артыкул 19. Кожны чалавек мае права на свабоду перакананьняў і на свабоднае выражаньне іх; у гэтае права ўваходзіць свабода бесьперашкодна трымацца сваіх перакананьняў і свабода шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю ды ідэі якімі-хаця сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў.

Арткул 20. 1. Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і асацыяцыяў.

2. Ніхто ня можа быць змушаны ўваходзіць у якую-небудзь асацыяцыю.

/працяг на наступнай старонцы/

Гэта -- закон па-за законам, супраць дэмакратызацыі і перабудовы.

Мы патрабуем:

1. Адмены згаданага Указа Прэзыдыума Вярхоўнага Савету БССР і правядзеньня рэфэрэндуму.
2. Адказнасьці ініцыятараў прыняцьця незаконнага Указу.
3. Афіцыйнага статусу для створаных грамадзкіх арганізацыяў: БНФ, Мартыралог Беларусі, "Талака" і інш.

Мы выражаем вотум недаверу цяперашняму кіраўніцтву Рэспублікі на чале з Сакаловым, Таразевічам, Кавалёвым.

Рэдакцыя "Студэнцкае Думкі"

Заўвага ад рэдакцыі: Указ у яго цяперашняй рэдакцыі, па сутнасьці, бязглузды. Афіцыйныя растлумачальнікі тлумачаць яго нам як забарону нацыянальнае сымболікі. Яны хлусяць, бо нельга забараніць тое, на што нават не прадугледжаны парадак атрыманьня дазволу. Адзіны дагэтуляшні закон пра сымболіку быў прыняты ў БССР у 1981 годзе, называецца ён "Аб сьцягах, і вымпелах дзяржаўных і грамадзкіх органаў, арганізацыяў Беларускай ССР і іхніх службовых асобаў" /гл. Збор законаў БССР, 1981, №15, арт. 294/. Там прадугледжаны парадак рэгістрацыі арганізацыямі і ўстановамі сваіх сьцягоў і вымпелаў: параходствамі -- у Мінрачфлёце, спартовымі таварыствамі - у Дзяржкамспорце і г.д. Але няма і ня можа быць законаў, які б вызначаў, якія сьцягі і вымпелы ўжываць асобнаму чалавеку. І як іх рэгістраваць". Такім чынам, калі хтосьці ад уласнага імя, а не ад прафсаюза, параходства ці фабрыкі "Камсамолка" узьнімае бел-чырвона-белы сьцяг, ён нічога не парушае, бо нельга парушаць законы, якіх няма.

Зрэшты, тут мы не адкрываем Амэрыкі. Пра гэта казаў і кандыдат юрыдычных навукаў А.Гараднюк у красавіцкай перадачы "Сустрэнемся пасьля адзінаццаці".

‡ ‡ ‡

Вядзьмак МЕНСКІ супроць беларускае Вандэі

Шаноўныя чытачы !

Надоечы, рэдакцыя нашае часапісі атрымала вершаваны допіс ад Ведзьмака МЕНСКАГА. Сёньня мы знаёмім Вас з творчасьцю гэтага славутага вершаплёта. Паэзія Ведзьмака МЕНСКАГА вызначаецца сваёй антыбюракратычнай завостранасьцю і сапраўднай грамадзянскай пазыцыяй, яна як бы штодзённы зрэз нашага складанага жыцьця. Зрэшты, меркаваць Вам...

УКАЗ МЕНСКАЙ ВАНДЭІ — ПАСЬЛЯ ПРАВАЛУ НА ВЫБАРАХ

Плён галоснасьці, перабудовы —
д р у к а в а н а е
в о л ь н а е
с л о в а —
апаратчыкі душаць "Указам",
тайным страхам, яўным маразмам,
дзе ўгалоўшчыну і палітыку
сталіністы зьмяшалі звыкла ...

Гэты "Указ" — за сьпіной народу —
незаконны, ганебны, подлы.
Зноў — вяртаньне глуму і зьдзеку.
Зноў — папраньне правоў чалавека.
За правал партбосаў на выбарах —
гэта помста "буйнога калібру".
Мітусьлівая, істэрычная.
Як і ўсё ў іх — трагі-камічная ...

Верхаводы Вандэі мяркуюць:
"Хто ў крэслах — зьляцець рызыкуюць:
калі зараз к а р а ня выбухне,
не асядзе свабоды вал —
на асеньніх — тутэйшых — выбарах
будзе поўны — ў Вандэі — завал ..."

Скажам тым верхаводам нягодным:
— Гэта — выклік правам міжнародным!
Скажам нашым Цанавам і Бэндам:
-- Па "Указу" — даеш рэфэрэндум!

А па-простаму: гэткаму "Указу"
самы раз — на сьметнік адразу!

Падслухаў і занатаваў
голас работніцкае клясы,
працоўнага сялянства і
народнай інтэлігенцыі --
Вядзямак Менскі.

МЕНСКАЯ АПЭРАЦЫЯ "ВЫБАРЫ"
/Ноч на 25 сакавіка 1989 г./

У Саюзе пісьменьнікаў БОМБА —
ажно дзесяць мільёнаў тон:
матар'ялы Народнага Фронту!..
Задрыжэў Сакалоў ... /і Галко/...

Тыя дрыжыкі — ў міліцыю
папаўзьлі тэлефонным званком ...
І заняў баявую пазыцыю
позна ноччу Менскі Галком.

Кампэтэнтныя тыя злодеі
габінэт нумар трыста шэсьць
узламалі і ... "абясшкодзілі":
ўратавалі свой "гонар" і "чэсьць".

/Пасьлязаўтра — ў Вярхоўны выбары,
а ў БОМБЕ — сіла цытат:
Сакалоў — ліжа Брэжневу лыткі ...
Галко — чарцы таварыш і брат .../

Сёньня — ўзламаюць хату пісьменьнікаў ...
Заўтра — йдуць мардаваць "Талаку" ...
Што ж ты, браце Валеры Пячэньнікаў,
ня ўздымеш пратэсту руку ?..

Мафіёзнай улады агонія
яшчэ шмат нам наробіць бед ...
Трэба, людцы, сёлетняй восеньню
добра чысьціць Вярхоўны Савет!

Матар'ялы грамадзкага
дасьледваньня абагуліў —
Вядзьмак Менскі.

ВАРТАЎНІКАМ ГУЛАГУ

У Галкоме партыі
вандэеўцы ўпартыя.
Бо для іх перабудова —
гэта "здрада Гарбачова"
іхняй д'ябальскай тыраніі
на [illegible]асьцях былой Расіі —
Праваслаўнай ... І[illegible]аслаўнай ...
як і ў іх — Самадзяржаўнай ...

Вера — новая ў Вандэі.
Вось — асноўныя "ідэі":

"... грамадзяне — нашы зэкі.
Хай мяняюцца Генсэкі —
толькі МЫ, намэнклятура,
партакратаў дыктатура
будзем вечна правіць сьветам:
селянінам, і паэтам,
і рабочым, і вучоным ... —
тым натоўпам незьлічоным ...

А як хто захоча ськінуць
нашу УЛАДУ — тыя зьгінуць
у астрозе, у дурдоме,
у застрашаным садоме ..."

Не, Вандэя, — мы ня зьгінем!
Бог народ наш — не пакіне!

За Жыцьцё мы будзем біцца
і на вёсцы, і ў сталіцы ...

Уваскросьне наша Памяць ...
Уваскросьне наша Мова ...
І ўздымецца над намі
Жыцьцядайны Крыж — нанова!

"П.С." /ПАЛІТЫЧНЫЯ СТАЛІНІСТЫ/ — СУПРАЦЬ БЕЛАРУСКАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

Халодная і мардабойная вайна "Вандэі",
здаецца дасягнула апагею:
узламалі дзьверы ў пісьменьніцкай хаціне —
і ў варанку пісьмёны пакацілі ...
штурмавікі халёныя ў цывільным
за песьні моладзь б'юць /як на Траецкім — білі/...
Прыручаная іхняя пракуратура
вачыма лыпае бязьвінна, быццам дура ...
Прыдурваюцца, шэльмы, — бо ўсё бачаць:
упэўнены — народ ня дасьць ім здачы ...
Дасьць! Але — мірна. Восеньню "Вандэя"
на выбарах наўрадці ацалее!..

Занатаваў Голас НАРОДУ —
Вядзьмак Менскі.

Gm Датыроўцы не падлягае
Рукапіс з культурнага пласта

ПРАМОВА НА СОЙМІКУ ЗЕМСКІМ МЕНСКІМ ШЛЯХЦІСКА СЛАВУТАГА РОДУ І СТАРЫХ ПАСЛУГ ПЕРАД РАДЗІМАЮ ПОЎНАГА ПЁТРЫ БАНДЭЙСКАГА

/Заканчэньне. Пачатак у № 5./

Акрыянам і анты-рынітарыям дазволены выезд з краіны, а маскалём — уезд, але з забаронаю вывазу карэліцкіх шпалераў і ўрэцкага шкла, якога самім бракуе, бо яно б'ецца на банкетах і балях, дзе мы гучна ўслаўляем нашага караля і новую гістарычную эпоху.

Але вядома, што ўсё гэта робіцца не з жаданьня дагадзіць гнілому бюргерска-пратэстанцкаму Захаду. Мы, прызнаючы свае памылкі і недахопы, усё ж застаемся адзіным апірышчам сьвятое веры, апошнім аплотам сапраўднага фэўдалізму, непарушнага канфэсыйнага саюзу. У нас ёсьць сьвятыя прынцыпы, запаветы Гарадзельскае вуніі і таму ўсе рэформы і павевы пэўную разумную мяжу мець павінны. Так, мы асудзілі дзеяньні інквізыцыі, выкрылі сапраўдныя мэты працаў Лышчынскага і Філіповіча. Але гэта ня сьведчыць пра адмаўленьне ад прынцыпаў сьв.Тройцы, сьв.Пісьма і Сьветлае Веры ў найсьвятлейшага Пана нашага. Таму дарэмна спадзяюцца тыя нашыя ворагі за мяжою, хто разьлічвае, што непарушная Рэч Паспалітая пойдзе шляхам пратэстантызму і гнілога бюргерскага парлямэнтарызму. Жыве Ягоная Каралеўская Мосьць! Жывуць сьветлыя ідэалы фэўдалізму! Мы раздушвалі і будзем раздушваць любыя спробы сэпаратызму й нацыяналізму. Мы глыбока спачуваем выміраючым народам Лівоніі і Эстляндыі, а таксама Украіне, якую спасьцігла катастрафічная Дняпроўская паводка, але лічым гэта Божаю караю за гнюсныя памкненьні паслабіць палітычна і эканамічна нашую вялікую дзяржаву /далей ідзе старабеларуская лаянка на адрас гетмана Сагайдачнага і магістратаў Эстляндскіх гарадоў/... Мы абвясьцілі талерантнасьць, але сапраўдны гэрэтык ёсьць сапраўдны гэрэтык. А калі ён выступае супроць самое ідэі фэўдальнае ўласнасьці на зямлю, альбо за сэкулярызацыю Царквы, Маці нашае, узгадаванай з падаткаў самога народу, то падобны ён да дзіцяці, якое кусае матчыныя грудзі і зьневажае наш паслухмяны і дабрачынны Люд! Мы, панове, павінны прыгадаць гэтым дзецям Бэльзэбуба, што наш сьвяты прынцып **LIBERUM VETO** — гэта не анархія!!!

Але! Панове магнаты і шлях. Нарэшце мы дачакаліся найвялікшае літасьці Іх Каралеўскае Мосьці Паноў-рады. Новым прывілеем Іх Каралеўскае Мосьці і Паноў-рады дараваная нам вольнасьць шляхецкая. Можам мы абіраць паслоў на Сойм Вальны і Сойм гэты зможа /страшна вымавіць/ вырашаць любыя пытаньні і нават у чымсьці кантраляваць нашага караля, Яго Сьветласьць, і найвялікшых паноў-раду. І адразу ж мы, шляхта, соль зямлі і стачавы хрыбет дзяржавы, пачалі паводзіцца як самыя апошнія хамы, татары ці маскалі. Нашыя зялезныя шыхты захваляваліся і пачалі расколвацца. Большая частка засталася верная каралю і дзяржаўнаму ладу. Але зьявіліся схізматы, вылюдкі, якія пачалі сумлявацца ў шчырасьці Яго Каралеўскае Мосьці і высакароднасьце ягоных намераў. Іншыя пачалі ствараць сэкты й падлянацца патаемным стодам — магнатам-прэтэндэнтам на каралеўскі трон. Замест маўклівае, але сталёвае падтрымкі каралеўскае ўлады і сьвятое Царквы, руплівае працы на лыцарскіх турнірах і балях, яны пачалі зьбірацца на глухіх фальварках і цьвінтарах і ўтвараць канфэдэрацыі. Гэткім шляхам яны хочуць захапіць уладу ў ваяводствах і прымусіць караля й дзяржаву панясьці шляхам задавальненьня іхніх жывёльных патрэбаў. Яны патрабуюць, каб ім далі магчымасьць набіць трыбух, яны хочуць апрануцца ў новыя аксамітныя жупаны, яны хочуць аддаць нашую зямлю хамам, якія самі ж нам яе і аддалі яшчэ колькі гадоў таму пад час валочнае памеры. Яны зганьбавалі імя шляхціца, адмовіўшыся ад зброі, але й мы ня маем покуль магчымасьці раздушыць іх зялезнай узброенай рукой. Паводле вэрдыкту мы правялі акруговыя сходы, на якіх самыя старыя і аўтарытэтныя з нас, у зручны час — калі ўся гэтая разбэшчаная моладзь адсыпалася пасьля начных зборышчаў, прасунулі нашых кандыдатаў. Яны ды іх памагатыя па тым баку мяжы паднялі віск і лямант. Нашых кандыдатаў яны абвінавачвалі ў тым, што тыя і раней былі ваяводамі, кашталянамі, вознымі, маршалкамі, падскарбіямі і гетманамі, судзьдзямі і падсуднамі і ніякае радасьці нікому ад гэтага ня было. Яны смакавалі пры людна ўсе нашыя памылкі, недахопы і пераігбы. Яны сабралі вакол сябе ўсіх гультаёў і абібокаў, з-за якіх і адбыліся ўсе гэтыя недахопы. Бо чым, як не суцэльным лайдацтвам падданых, тлумачыцца крызіс фэўдалізму..."

/Працяг рукапісу ня знойдзены./

Заўвагі да тэксту і гістарычныя камэнтары

II. Рэлігійныя сэкты, што адмаўлялі прагрэсыўнасьць фэўдалізму.

/працяг на наступнай старонцы/

12. Дзьве аднёзныя асобы, якія пісалі кніжачкі, покуль народ паспаліты працаваў у поце твару свайго. Скончылі дрэнна.
13. Асзін з кіраўнікоў казацка-украінскага сэпаратызму. Надзіва, памёр сваёй сьмерцю у 1642.
14. Сэкулярызацыя —ператварэньне царкоўнай уласнасьці у сьвецкую і г.д.
15. Вольнае права вэта — галоўнае дасягненьне фэўдальнае дэмакратыі.
16. Буйная аграрная рэформа, што ўтварыла плянавую фэўдальную гаспадарку.
17. Кіраўнічыя пасады.

УСЕАГУЛЬНАЯ ДЭКЛЯРАЦЫЯ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА

ПРЭАМБУЛА

Бяручы пад увагу, што прызнаньне годнасьці, якая ўласьцівая ўсім членам людзкое сям'і, ды роўных і неадымных правоў, становіць аснову свабоды, справядлівасьці й агульнага міру; і

бяручы пад увагу, што занядбаньне й пагарда да правоў чалавека прывялі да варварскіх актаў, якія абураюць сумленьне чалавецтва ды што стварэньне такога сьвету, у якім людзі будуць мець свабоду слова й перакананьняў ды будуць вольныя ад страху й нястачаў, абвешчана як высокае імкненьне людзей; і

бяручы пад увагу, што неабходна, каб правы чалавека ахоўваліся сілаю закону з мэтай забясьпечаньня таго, каб чалавек ня быў змушаны ўзьнімаць бунту, як апошняга сродку, супраць тыраніі ды ўціску; і

бяручы пад увагу, што неабходна спрыяць разьвіцьцю прыязных дачыненьняў паміж народамі; і

бяручы пад увагу, што народы Аб'яднаных Нацыяў пацьвердзілі ў Статуце сваю веру ў асноўныя правы чалавека, у годнасьць і каштоўнасьць чалавечай асобы і ў роўнасьць мужчынаў і жанчын ды пастанавілі спрыяць сацыяльнаму прагрэсу й паляпшэньню ўмоваў жыцьця пры большай свабодзе; і

бяручы пад увагу, што дзяржавы-члены забавязаліся спрыяць, у супрацоўніцтве з Арганізацыяй Аб'яднаных Нацыяў, усеагульнай пашане ды захаваньню правоў чалавека й асноўных свабодаў; і

бяручы пад увагу, што агульнае разуменьне характару гэтых правоў і свабодаў мае вялізарнае значаньне для поўнага выкананьня гэтага забавязаньня,

ГЕНЭРАЛЬНАЯ АСАМБЛЕЯ
абвяшчае гэтую

УСЕАГУЛЬНУЮ ДЭКЛЯРАЦЫЮ ПРАВОЎ ЧАЛАВЕКА як агульнае заданьне, да выкананьня якога павінны імкнуцца ўсе народы і ўсе дзяржавы, каб кожны чалавек і кожны орган грамадзтва, заўсёды маючы на ўвазе гэтую Дэклярацыю, імкнуліся шляхам навучаньня й адукацыі спрыяць пашане гэтых правоў і свабодаў ды забясьпечаньню, шляхам нацыянальных і міжнародных прагрэсыўных захадаў, усеагульнаму й эфэктыўнаму прызнаньню і зьдзейсьненьню як сярод народаў дзяржаваў-членаў Арганізацыі, гэтак і сярод народаў тых тэрыторыяў, што знаходзяцца пад іхнай юрысдыкцыяй.

Артыкул 1. Усе людзі родзяцца свабоднымі і роўнымі ў сваёй годнасьці і ў правах. Яны надзеленыя розумам і сумленьнем ды павінны дзейнічаць у дачыненьні адзін да аднаго ў духу братэрства.

Артыкул 2. Кожны чалавек павінен мець усе правы і ўсе свабоды, абвешчаныя гэтай Дэклярацыяй, незалежна ад расы, колеру скуры, полу, роду, мовы, рэлігіі, палітычных або іншых перакананьняў, нацыянальнага або сацыяльнага паходжаньня, маемаснага, станавага або іншага палажэньня.

Апрача таго, не павінна праводзіцца ніякае розьніцы на аснове палітычнага, праўнага або міжнароднага статусу краіны або тэрыторыі, да якой чалавек належыць, незважаючы на тое, ці гэтая тэрыторыя незалежная, падапечная, несамакіраўнічая, або як-небудзь інакш абмежаваная ў сваім сувэрэнітэце.

Артыкул 3. Кожны чалавек мае права на жыцьцё, на свабоду і на асабістую недатыкальнасьць.

Артыкул 4. Ніхто не павінен трымацца ў рабстве ці ў падняволным стане, нявольніцтва й гандаль нявольнікамі забараняюцца ўва ўсіх іхных формах.

Артыкул 5. Ніхто не павінен быць паддаваны катаваньням або жорсткім, бесчалавечным ці гэткім абыходжаньню й пакараньню, што зьневажаюць ягоную годнасьць.

Артыкул 6. Кожны чалавек, дзе-б ён ні знаходзіўся, мае права на прызнаньне ягонае правасуб'ектнасьці.

Артыкул 7. Усе людзі роўныя перад законам і маюць права безь якое ні было-б розьніцы на роўную абарону іх законам. Усе людзі маюць права на роўную абарону ад якое-б там ні было дыскрымінацыі, што парушае гэтую Дэклярацыю, і ад якога-б там ні было падбухторваньня да гэткае дыскрымінацыі.

Артыкул 8. Кожны чалавек мае права на эфэктыўнае аднаўленьне ў правох кампэтэнтнымі нацыянальнымі судамі ў выпадку парушэньня ягоных асноўных правоў, дадзеных яму канстытуцыяй ці законам.

Артыкул 9. Ніхто ня можа быць падданы адвольнаму арышту, затрыманы або выгнаны.

Артыкул 10. Кожны чалавек, для вызначэньня ягоных правоў і абавязкаў і для ўстанаўленьня абгрунтаванасьці пастаўленага яму крымінальнага абвінавачаньня, мае права, на аснове поўнай роўнасьці, на тое, каб ягоная справа была разгледжаная публічна і з датрыманьнем усіх вымогаў справядлівасьці незалежным і бесстаронным судом.

Артыкул 11. 1. Кожны чалавек, абвінавачаны ў выкананьні злачынства, мае права ўважацца за невінаватага датуль, пакуль ягоная вінаватасьць ня будзе ўстаноўленая законным парадкам шляхам публічнага судовага разгляду, пры якім яму забясьпечваюцца ўсе магчымасьці для абароны.

2. Ніхто ня можа быць засуджаны за злачынства на аснове ўчыненьня якога-небудзь дзеяньня ці за бязьдзеяньне, якія ў часе іхнага ўчыненьня не становілі злачынства паводля нацыянальных законаў ці паводля міжнароднага права. Ня можа гэксама накладацца пакараньне цяжэйшае за тое, якое магло-б быць ужытае ў тым часе, калі злачынства было зробленае.

Артыкул 12. Ніхто ня можа быць падданы адвольнаму ўмяшаньню ў ягонае асабістае і сямейнае жыцьцё, адвольнаму пасяганьню на недатыкальнасьць ягонага жытла, таямніцу ягонае карэспандэнцыі або на ягоны гонар і рэпутацыю. Кожны чалавек мае права на абарону з боку закону ад такога ўмяшаньня ці такіх пасяганьняў.

Артыкул 13. 1. Кожны чалавек мае права свабодна перамяшчацца і абіраць сабе месца пражываньня ў межах кожнае дзяржавы.

2. Кожны чалавек мае права пакідаць якую-хаця краіну, у тым ліку і сваю ўласную, і варочацца ў сваю краіну.

Артыкул 14. 1. Кожны чалавек мае права шукаць прытулку ад перасьледаваньня ў іншых краінах і карыстацца гэтым прытулкам.

2. Гэтае права ня можа быць выкарыстанае ў выпадку перасьледаваньня, якое ў запраўднасьці вынікае з выкананьня непалітычнага злачынства або дзеяньня, супярэчнага мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў.

Артыкул 15. 1. Кожны чалавек мае права на грамадзянства.

2. Ніхто ня можа быць адвольна пазбаўлены свайго грамадзянства або права зьмяніць сваё грамадзянства.

Артыкул 16. 1. Мужчыны и жанчыны, што дасягнулі паўналецьця, маюць права без усякіх абмежаваньняў паводля адзнакі расы, нацыянальнасьці або рэлігіі, уваходзіць у шлюб і засноўваць сям'ю. Яны карыстаюцца аднолькавымі правамі што да ўзяцьця шлюбу, у часе знаходжаньня ў шлюбе і пры скасаваньні яго.

2. Шлюб можа быць заключаны толькі пры свабоднай і поўнай згодзе абодвух бакоў, што ўваходзяць у шлюб.

3. Сям'я — натуральная і асноўная ячэйка грамадзтва і мае права на абарону з боку грамадзтва і дзяржавы.

Артыкул 17. 1. Кожны чалавек мае права валодаць маемасьцяй як адна-асабова, гэтак і супольна зь іншымі.

2. Ніхто не павінен быць адвольна пазбаўлены сваае маемасьці.

Артыкул 18. Кожны чалавек мае права на свабоду думкі, сумленьня і рэлігіі; у гэтае права ўваходзіць свабода зьмяняць сваю рэлігію ці перакананьні і свабода вызнаваць сваю рэлігію і перакананьні як аднаасабова гэтак і супольна зь іншымі, публічным або прыватным парадкам у вучэньні, багаслужбе ды выкананьні рэлігійных і рытуальных абрадаў.

Артыкул 19. Кожны чалавек мае права на свабоду перакананьняў і на свабоднае выражаньне іх; у гэтае права ўваходзіць свабода бесперашкодна трымацца сваіх перакананьняў і свабода шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю ды ідэі якімі-хаця сродкамі і незалежна ад дзяржаўных межаў.

Арткул 20. 1. Кожны чалавек мае права на свабоду мірных сходаў і асацыяцыяў.

2. Ніхто ня можа быць змушаны ўваходзіць у якую-небудзь асацыяцыю.

Артыкул 21. 1. Кожны чалавек мае права браць удзел у кіраўніцтве сваёй краінай беспасярэдня або праз свабодна абраных прадстаўнікоў.

2. Кожны чалавек мае права роўнага доступу да дзяржаўнай службы ў сваёй краіне.

3. Воля народу павінна быць асновай улады ўраду; гэтая воля павінна выяўляцца ў перыядычных і нефальсыфікаваных выбарах, якія павінны праводзіцца пры усеагульным і роўным выбарчым праве, шляхам тайнага галасаваньня або шляхам іншых раўназначных формаў, што забясьпечваюць свабоду галасаваньня.

Артыкул 22. Кожны чалавек, як член грамадзтва, мае права на сацыяльнае забясьпечаньне і на зьдзейсьненьне неабходных для падтрыманьня ягонае годнасьці і для свабоднага разьвіцьця ягонае асобы правоў у эканамічнай, сацыяльнай і культурнай галінах праз нацыянальныя намаганьні і міжнароднае супрацоўніцтва ды ў адпаведнасьці са структурай і рэсурсамі кожнае дзяржавы.

Артыкул 23. 1. Кожны чалавек мае права на працу, на свабодны выбар працы, на справядлівыя й спрыяльныя ўмовы працы ды на ахову ад беспрацоўя.

2. Кожны чалавек безь якой-бы там ні было дыскрымінацыі мае права на роўную аплату за роўную працу.

3. Кожны, хто працуе, мае права на справядлівае і задавальняючае ўзнагароджаньне, якое забясьпечвае годнае чалавека існаваньне для яго самога і ягонае сям'і, і якое, пры неабходнасьці, дапаўняецца іншымі сродкамі сацыяльнага забясьпечаньня.

4. Кожны чалавек мае права ствараць прафэсійныя саюзы і ўваходзіць у прафэсійныя саюзы для абароны сваіх інтарэсаў.

Артыкул 24. Кожны чалавек мае права на адпачынак і на вольны час, у тым ліку права на разумнае абмежаваньне працоўнага дня ды на аплочваны перыядычны водпуск.

Артыкул 25. 1. Кожны чалавек мае права на такі жыцьцёвы ўзровень, у тым ліку на ежу, вопратку, жыльлё, мэдычны догляд і патрэбнае сацыяльнае абслугоўваньне, які неабходны для падтрыманьня здароўя і дабрабыту яго самога і ягонае сям'і, ды мае права на забясьпечаньне на выпадак беспрацоўя, хваробы, інваліднасьці, удоўства, надыходу старасьці або іншага выпадку страты сродкаў да існаваньня зь незалежных ад яго абставінаў.

2. Мацярынства й дзяцінства даюць права на асаблівую апеку і дапамогу. Усе дзеці, што нарадзіліся ў шлюбе або бяз шлюбу, павінны карыстацца аднолькавай сацыяльнай аховай.

Артыкул 26. 1. Кожны чалавек мае права на адукацыю. Адукацыя павінна быць дармавой, прынамся, адукацыя пачатковая і агульная. Пачатковая адукацыя павінна быць абавязкавай. Тэхнічная і прафэсійная адукацыя павінна быць агульнадаступнай, і вышэйшая адукацыя павінна быць аднолькава даступнай для ўсіх на аснове здольнасьцяў кожнага.

2. Адукацыя павінна быць накіраваная да поўнага разьвіцьця чалавечай асобы і да зьбольшаньня паважаньня правоў чалавека й асноўных свабодаў. Адукацыя павінна спрыяць узаемаразуменьню, цярпімасьці і дружбе паміж усімі народамі, расавымі або рэлігійнымі групамі ды павінна спрыяць дзейнасьці ААН для падтрыманьня міру.

3. Бацькі маюць права прыярытэту ў выбары віду адукацыі для сваіх малалетніх дзяцей.

Артыкул 27. 1. Кожны чалавек мае права свабодна ўдзельнічаць у культурным жыцьці грамадзтва, цешыцца мастацтвам, удзельнічаць у навуковым прагрэсе і карыстацца ягонымі дасягненьнямі.

2. Кожны чалавек мае права на абарону ягоных маральных і матэр'яльных інтарэсаў, што вынікаюць з навуковых, літаратурных або мастацкіх працаў, аўтарам якіх ён зьяўляецца.

Артыкул 28. Кожны чалавек мае права на нацыянальны і міжнародны парадак, пры якім правы і свабоды, выкладзеныя ў гэтай Дэклярацыі, могуць быць поўнасьцяй ужыцьцёўленыя.

Артыкул 29. 1. Кожны чалавек мае абавязкі перад грамадзтвам, у якім толькі і магчымае свабоднае ды поўнае разьвіцьцё ягонае асобы.

2. Пры ўжыцьцяўленьні сваіх правоў і свабодаў, кожны чалавек будзе паддадзены толькі такім абмежаваньням, якія ўстаноўленыя законам выключна ў мэтах забясьпечаньня патрэбнага прызнаньня ды пашаны правоў і свабодаў іншых людзей і задавальненьня справядлівых патрабаваньняў маралі, грамадзкага парадку й агульнага дабрабыту ў дэмакратычным грамадзтве.

3. Ужыцьцяўленьне гэтых правоў і свабодаў ні ў якім выпадку не павінна супярэчыць мэтам і прынцыпам Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў.

Артыкул 30. Нічога ў гэтай Дэклярацыі ня можа быць вытлумачана як даваньне якой-хаця дзяржаве, групе асобаў або асобным людзям права займацца якой-небудзь дзейнасьцю або рабіць дзеяньні, скіраваныя на зьнішчэньне правоў і свабодаў, абвешчаных у гэтай Дэклярацыі.

**Прынятая Генэральнай Асамблеяй
10 сьнежня 1948 г.**

БЕЛАРУС № 351 Сьнежань 1988 г.

Друкуецца паводле газэты амэрыканскіх беларусаў, якая мае назову "Беларус" /№ 354, сьнежань 1989г./

ПРО НАС ПИШУТ...

1

Трэба прама сказаць, што для многіх матэрыялаў уласцівыя блытаніна, метадалагічная беспадстаўнасць і эклектызм, фактычна антыперабудоўная ідэалагічная накіраванасць, хаця яны і падаюцца ў абрамленні «клопату» пра перабудову. Працэсы і з'явы грамадскага жыцця асвятляюцца з пазіцый антыгістарызму. Напрыклад, у бюлетэні «Студэнцкая думка» (№ 3, 1989 г.) з нагоды правапісу некаторых беларускіх слоў зазначаецца: «Гэта — вяртанне да незамутнёных крыніц нашага Адраджэння 1905—1930 гадоў...» У такім спалучэнні знікае спецыфіка гістарычных паваротаў у грамадскім развіцці, фактычна адмаўляецца значнасць сацыялістычнай рэвалюцыі ў лёсе беларускага народа.

Асаблівую трывогу выклікае тое, што большасць матэрыялаў прасякнуты прамымі або ўскоснымі антырускімі выпадамі, перапяваюць тэзіс буржуазнай нацыяналістычнай прапаганды аб «прымусовай русіфікацыі» беларускага народа. Ідэі інтэрнацыяналізму, дружбы народаў, канструктыўныя пошукі шляхоў удасканальвання міжнацыянальных адносін, што вядуцца партыяй, цалкам ігнаруюцца і замоўчваюцца. Такім чынам, ствараецца скажоная карціна цяперашняга стану нацыянальных і міжнацыянальных адносін.

2

Самодеятельное объединение «Світанак» (Белорусский технологический институт) о своей цели заявило так: «На протяжении 20—30-х годов в древней столице Белоруссии — Вильно белорусским студенчеством издавался общественно-научный и литературный журнал «Студенческая мысль» Сегодня мы ощущаем себя наследниками тех борцов-студентов, которые в условиях порабощенной буржуазной Польшей Западной Белоруссии будили заспанную национальную сознательность белорусов. Цели, положенные так много лет тому назад, пока не осуществлены. И потому начнем с наследия!».

Лидеры «Світанка» не отдают себе отчета в том, что упомянутый журнал отнюдь не отражал революционных и демократических устремлений трудящихся Западной Белоруссии. Его идеи в значительной своей части совпадали со взглядами деятелей небезызвестной БНР.

НАШ КАМЭНТАР.

Першая з гэтых выняткӑў належыць пяру невядомага аўтара і ўзятая намі зь любімай газэты ўсіх менчукоў "Вечаровага Менску"/"Вячэрні Мінск"/ ад 26 красавіка сёлета. Артыкул мае назоў ""Першапраходцы"ў перабудове, або Да чаго заклікаюць так званыя "сябры народа"?". На думку ананіма зь "Вечаровага Менску" /ці дакладней праблемнай групы Менскай ВШП і Інстытута гісторыі партыі пры ЦК Кампартыі Беларусі па пытаньнях нацыянальнае палітыкі й міжнацыянальных дачыненьняў/, выступаць за вяртаньне даўнейшае граматыкі ды правапісу беларускае мовы, скалечанае сталінскай рэформай 1933 году ёсьць ня што іншае, як "фактычнае адмаўленьне значнасьці сацыялістычнае рэвалюцыі ў лёсы беларускага народу". Адным словам, сталінская рэформа 1933 году, на думку таварышаў з "праблемнае групы", — і ёсьць сацыялістычная рэвалюцыя. У сьвятле гэткіх сьцьвярджэньняў дужа цікава ўспрымаюцца словы першага сакратара праўленьня СП Беларусі Ніла Гілевіча, якія ён прамовіў на лістападаўскім (1987 г.) пленуме праўленьня Саюза пісьменьнікаў Беларусі: "...Як на відавочны прыклад таго, да чаго нам трэба вярнуцца практычна, спашлюся на рэформу беларускага правапісу, праведзеную дэкрэтам Урада БССР ад 1933 года; гэтай рэформай было, апрача ўсяго іншага, ліквідавана абазначэньне мяккасьці зычных гукаў на пісьме — чым была нанесена нашай мове страшэнная шкода. Пазбаўленая адной з самых адметных сваіх фанэтычных рысаў, яна аказалася зьнявечанай і скалечанай і гэткаю застаецца дасюль. Нагадаю, што гэта было зьдзейсьнена ў час самага разгулу пагромшчыкаў нацыянальнае культуры. Няма ў нас маральнага права і надалей мірыцца з пасьледкамі той экзэкуцыі, якую ўчынілі невукі і чыноўныя бюракраты над аднэй з самых прыгожых моваў славянскага сьвету."/паводле газэты"Літаратура й Мастацтва" ад 13 лістапада 1987 г./. Па лёгіцы ананімаў, і шаноўны спадар Гілевіч скаціўся да "адмаўленьня значнасьцяў сацыялістычнай рэвалюцыі", і старэйшыя пісьменьнікі Беларусі ахвяры сталінскага тэрору Максім Лужанін і Ян Скрыган /даўна і настойліва выступаюць за вяртаньне правільнага беларускага правапісу і граматыкі/, і шэраг іншых культурных дзеячоў Беларусі: Васіль Зуёнак, Эрнэст Ялугін, Кастусь Тарасаў, Адам Мальдзіс, Анатоль Сідарэвіч ды іншыя.

Астатняя частка артыкула прысьвечаная паліваньню брудам іншых самвыдавецкіх білютэняў і праграмы Беларускага Народнага Фронта за перабудову "Адраджэньне". Мы ня ставім сабе на мэце даць дэталёвы адказ на гэты брэх, мяркуем, што чытачы "Вечаровага Менску" самі разабраліся дзе праўда, а дзе мана. І усё ж мы ня можам ня даць водпаведзі на яўную, непрыхаваную хлусьню.

Пытанне аб незалежнасці БССР у міжнародных адносінах абсалютызуецца да такой ступені, што па сутнасці адмаўляецца канстытуцыйны прынцып савецкай федэрацыі, пакладзены ў аснову функцыяніравання Саюза ССР. Аўтары свядома замоўчваюць тое, што БССР з'яўляецца членам ААН, ёй дадзены істотныя паўнамоцтвы ў вырашэнні міжнародных праблем і яна актыўна выкарыстоўвае іх на міжнароднай арэне.

Вось так, да прыкладу, рэцэнзуецца Праграма БНФ: "Аўтары свядома замоўчваюць тое, што БССР з'яўляецца членам ААН, ёй дадзены ..." Але прабачце, частка Праграмы БНФ "Адраджэньне", якая мае назоў "Сувэрэнітэт", якраз і грунтуецца на ўсебаковым прызнаньні Беларусі як члена-заснавальніка Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў. Для перакону цытуем пачатак часткі "Сувэрэнітэт": "Сувэрэнітэт Беларусі абвешчаны і ахоўваецца Канстытуцыяй Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі і падмацоўваецца яе статусам члена-заснавальніка Арганізацыі Аб'яднаных Нацыяў."

Цэлы шэраг палітычна нясталых, экстрэмісцкіх меркаванняў змяшчаецца ў самвыдаўскім бюлетэні «Факт» (№ 2, 1989 г.), дзе ўсхваляюцца ўзяўтыя з дакументаў народных франтоў Прыбалтыйскіх рэспублік палажэнні, якія ставяць пад сумненне кіруючую ролю КПСС у жыцці савецкага грамадства. На думку аргкамітэту БНФ, які з'яўляецца выдаўцом гэтага бюлетэня, аказалася дэкларацыя так званага «Дэмакратычнага саюза», у якой утрымліваюцца паклепніцкія сцвярджэнні, што КПСС прывяла краіну на грань банкруцтва, абвяшчаецца таксама, што партыя («партакратыя») з'яўляецца галоўнай крыніцай народных бед.

Далей Аргкамітэт БНФ "Адраджэньне" называюць выдаўцом бюлетэня "Факт". Але ж ці так гэта? Калі б "Факт" выходзіў па-беларуску, дык зважаючы на тое, што ў "праблемнай групе пры Менскай ВШП і Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК ..." слаба ведаюць гэтую мову, можна было б зразумець — ня здолелі прачытаць, памыліліся. Але ж "Факт" выдаецца па-расейску... "Факт" зьяўляецца выданьнем адной з групаў падтрымкі БНФ, рэдактар-выдавец Гурэвіч Міхась, але ніяк не Аргкамітэт БНФ "Адраджэньне".

Другая вынятка ўзятая з артыкула шырака вядомага на Беларусі змагара супроць "сыянісцкае пагрозы" ./сябра й паплечнік У.Бегуна/загадчыка катэдры гісторыі КПСС Беларускага тэхналягічнага інстытута А.Малашкі/"Советская Белоруссия"19/2/89.

Чые ж памкненьні адлюстроўвалі выдаўцы віленскае "Студэнскае Думкі"? Зь якіх сацыяльных пластоў беларускага грамадзтва Заходняе Беларусі мелі яны паходжаньне? На думку шаноўнага А.Малашкі, "журнал отнюдь не отражал революционных и демократических устремлений трудящихся Западной Белоруссии". А вось, да прыкладу, што заяўляла пра сябе сама рэдакцыя "Студэнскае Думкі"/№3/10/1928, стар.33/: "Маладыя гарачыя сілы з шэрых, родных, закіданых вёсак зьляцеліся на ўнівэрсытэт, каб чэрпаць сьвятло вышэйшае навукі. У сэрцах іх шмат агня, шмат пачуцьцяў сьвятых, шмат думак, імкненьняў і ідэалаў. Яны хочуць і другіх вучыць, хочуць вучыць і выхоўваць народ свой. Цяжкая праца і дарога цярністая, але гэта не палохаець іх, — зорка-думка прысьвечваець і трымаець іх: служыць роднаму Народу і яго патрэбам, злучыцца зь ім духова — даць яму пажыву для душы..." Камэнтары, як бачым, залішнія.

Карыстаючыся нагодай гэтых нататкаў, хочацца згадаць сёньня апошні мітынг БНФ "Адраджэньне" каля Прэзыдыўма АН Беларусі які адбыўся 1 траўня. Быў на ім тав. Малашка і яго заўсёдны спадарожнік, супрацоўнік па катэдры тав. Казьлякоў. Заўважым, што ў гэткім складзе яны прысутнічалі бадай на ўсіх ранейшых мітынгах. "Група адпору" стаяла ў баку і вяла гучныя спрэчкі, замінаючы людзям слухаць прамоўцаў. На адну з заўвагаў гаварыць цішэй і просьбу адыйсьці далей ад натоўпу, А.Малашка выгукнуў: "А вы со своим фюрером — Пазняком мне не указывайте !" Абураны натоўп узяў пад рукі парушальнікаў парадку і спраўна выпхнуў іх. Трэба зазначыць, што тав. Казьлякоў упіраўся больш зацята і галасна паўтараў: "Я имею право присутствовать !" На што натоўп дружна адказваў: " А вы нам непатрэбныя !"...

Камэнтаваў Алесь Гуркоў

Кроніка ды крытыка рэйзу ВЯЗАНКА—ДЗЯВОЧАЯ ГАРА—РАКАЎ *7—9 траўня*

Скарыстаўшы нагоду сьвятаў, рэпрэзэнтанты беларускіх суполак сабраліся раніцою 7-га траўня ў Вязанцы, дзе адразу патрапілі пад непрыхаванае зацікаўленьне прадстаўнікоў "властей" /як у форме, гэтак і "без оной"/. Ня маючы намеру спрыяць ахвотным да інцыдэнтаў органам улады, але даволі шпарка парушылі пад нацыянальнай сымболікай у бок Дзявочай гары, што ля вёскі Дубрава. Не пасьпеўшы як належыць напяць намёты ды павячэраць, мусілі прымаць высокіх гасьцёў. Нас наведаў начальнік

мясцовага райадзьдзелу міліцыі. Пасьля сьціплых спробаў забараніць ужываньне нацыянальнае сымболікі /бел-чырвона-белых сьцягоў/, дзе ён пры ўсёй сваёй вышэйшай філялягічнае адукацыі канчаткова заблытаўся ў тэрмінах ды акрэсьленьнях, "высокая парсуна" нас пакінула. Зрэшты, /як нам было растлумачана — ў мэтах забясьпечаньня нашае бясьпекі/ ля вогнішча засталіся двое апранутых у цывільнае шэраговых міліцыянтаў. Праўда, адзін зь йіх апынуўся надзіва адукаваным і ўжо ўначы загнаў С.Вітушку ў кут пытаньнем — чыю юрысдыкцыю ён вызначае — БНР /Беларускай Народнай Рэспублікі/ ці БССР? Але гэта так дробязь. Ну а асноўнае, безумоўна было тое, што К.Мацкевіч зь С.Вітушкам паказалі невялічкую сцэнку пра гісторыю Дзявочай гары ад балтаў ды крывічоў і аж да леташняга раскопу Э.Зайкоўскага... Назаўтра даволі нясьпешна, часьцяком прыпыняючыся, прайшлі да Ракава. Сталі лягерам на цудоўнай Іслачы /дзякуй Богу, што валожынская міліцыя апынулася яўна больш гультайскай, чым маладэчанская і чапаваць з намі не пажадала/. Вечар і ноч былі чароўныя. Нарэшце патрапілася паразмаўляць, пасьпяваць песьні ў спакойных абставінах. Ну а пад раніцу пачалі разьязджацца.

Гэтая выцечка выявіла багата якія хібы нашае канфэдэрацыі. Былі рэпрэзэнтаваныя натыня ўсе суполкі, мала было прапазыцыяў наконт будучых імпрэзаў. Дый гэтая імпрэза мела яўна забаўляльна-шпацыровы характар. Занадта мы паверылі запэўніваньням ахвіцыйных асобаў наконт **"BIELORUSSIAN DYSNEY LAND"** Мала працавалі зь мясцовымі жыхарамі. Ну а плюсы?.. Ведама ёсьць. Па-першае — пабачыліся, паразмаўлялі. Па-другое — зьявілася задума адзначыць у верасьні 475-я ўгодкі перамогі Кастуся Астрожскага над маскалямі пад Воршай. Трэба не паўтараць памылак і падыйсьці да гэтага юбілею больш адказна.

Ваадзім Алексанаровіч

P.S. І вось што яшчэ — тыя хто быў у вандроўцы пачулі новую выдатную песьню. Яе склаў хлапец з Воршы /шкадую, што не памятаю яго імя ды прозьвішча/. Зычу "С.Д." у наступным нумары надрукаваць яе тэкст ды акорды. Яна таго вартая.

НАКАЗ З'ЕЗДУ
НАРОДНЫХ ДЭПУТАТАЎ СССР

Каб застой не вярнуўся нанова:
Старшынёй — М.С.Гарбачова!
Каб чынуш павуціньне расплесьці нам:
Старшынёй апазіцыі — Ельцына!
Апазіцыя — канструктыўная:
негвалтоўна-альтэрнатыўная ...
І ўваскросьне Свабоды Дух —
Усесаюзны Народны Рух!

Зьніч

АДКРЫТЫ ЛІСТ
ЧЛЕНАМ КАМПАРТЫІ Б Е Л А Р У С І

КАБ АЧЫСЬЦІЦЬ ШЛЯХ ПЕРАМЕНАМ,
ЗЬНЯЦЬ СУМЛЕНЬНЕ І РОЗУМ ЗЬ ЦЬВІКА —
КЛІЧЦЕ Н А Ш НАДЗВЫЧАЙНЫ ПЛЕНУМ:
ТРЭБА ВЫГНАЦЬ
"ВАНДЭЮ"
З ЦК !..

Турыстычная лексыка

У сувязі з надыходам турыстычнай пары мы падаем сёньня невялічкі расейска-беларускі слоўнічак для аматараў вандровак.

снаряжение — рыштунак
рюкзак — заплечнік
одеяло — коўдра
топор — сякера, сякерка
чехол — покрыва, /маленькі/футарал
ведро — вядро
кастрюля — рондаль
фонарик — ліхтарык
азимут — азымут
аптечка — зельня, зяльнічка
верёвка — вяроўка, матузок, абора, вяровачка, пастромак, вяруга, лейчына, гуж
лодка — човен, чайка
плот — плыт
велосипед — ровар
грести — веславаць
весло — вясло
лыжи — ірты
лыжник — ірцяр
подъём — уздойм
привал — спачын
тропка — сьцежка
дорога — шлях, тракт, гасьцінец
экспедиция — выправа, выправіцца
поход — вандроўка
карта — мапа
ориентироваться — арыентавацца
палатка — намёт
колышек — калок, калочак
ночёвка — начлег
инструктор — наказчык
костёр — вогнішча
топливо — паліва
дрова — дровы
ветер — /паўднёвы/ вырай
/паўночны/ сівер
/заходні/ сутон
/усходні/ усток
вецер, /цёплы/ вятрыска
ласты — плаўні
акваланг — акваланг
стоянка — пастой
трос — ліна
бичёвка — ліна, абора
колпак — каптур, чапец
штормовка — штармоўка
сковорода — патэльня
ручка сковороды — дзяржальна
чайнік — імбрык, імбрычак
рюмка — чарка, кілішак
бокал — келіх
для пива — куфаль
кружка — кубак, кварта
/мэталёвая/ конаўка
чашка — кубачак, філіжанка
фарфор — парцаляна
эмаль — паліва
эмалированный — паліваны
блюдце — сподак
солонка — сальніца
маслёнка — масьляніца
доска для резки — дэнка, дэнца
карандаш — аловак
стержень — стрыжань
ковёр — дыван, кілім, кілімчык
духи — парфума
брошка — сушпілка
заколка — прыкалка, приколка
платок — хустка, /зьвязаная/вязанка, /тканая/касьміроўка
шнурок — матузок, /у чаравіках/заварсень
лента — стужка, /у валасох/касьнік
кружева — карункі
пододеяльник — нагортка
покрывало — капа, посьцілка
наволочка — наўлечка
полотенце — ручнік, /для посуду/скарэч
тёрка — тарка
штопар — шніпар
солёный — салёны
сладкий — салодкі
сырой — вогкі
ядовитый — атрутны
аромат — водар
жидкость — вадкасьць
направляющий — павадыр
турист — турыст
питание — сілкаваньне, харчаваньне
экскурсия — выцечка
днёвка — днёўка
фляга — пляха, біклага, біклажка
бахилы — бахілы
ботинки — чаравікі
руль — стырно
рулевой — стырнавы
стать лагерем — асталявацца, атабарыцца
нижнее бельё — сподняя бялізна
калона — калёна, ісьці гужам
кеды — кеды
кроссовки — спартовікі
надувной матрас — надзіманы ляжак
парусьнік — вятружнік
киль — стаяк, хрыбет
карабин — зашчапка
каркас — суклёт, суклётны

Шчыра дзякуем!

Рэдакцыя "Студэнцкае Думкі" ад імя ісіх беларусаў Беласточчыны /Польшча/ выказвае сардэчную падзяку жыхару вёскі Жгунская Буда /Гомельшчына/ спадару Аляксандру Акулічу за дасланую на адрас рэдакцыі пасылку з кніжкамі для нашых суайчыньнікаў. Рэдакцыя нагадвае, што збор кніг для навучэнцаў Беларускага ліцэя ў Бельску-Падляскім /Польшча/ працягваецца.

УВАГА !!!

Рэдакцыйная суполка зьвяртаецца да шаноўных чытачоў нашае часапісі са шчырай просьбаю дасылаць матар'ялы характару культурна-грамадзкага, палітычнага, эканамічнага, экалягічнага, навуковага, літаратурна-мастацкага, гумарыстычнага, сатырычнага, абвесткі.

Наш адрас: Беларусь, 220100, места Менск, вул. М. Горкага, д. 143, кв. 65, Гуркову Алесю.
Тэл. 34-42-78 - хатні.

Нумар падрыхтавалі: Аніськова Галіна, Гуркоў Алесь, Сабаленка Алесь, Селяццоў Уладзя, Рагуля Аляксей, Барвенава Ганна.

Апрацоўка нумара закончана напачатку траўня 1988 г.
Перадрук дазваляецца толькі са спасылкай на крыніцу.
Нумар падрыхтаваны ў двух асобніках, просьба да ўсіх сяброў нашае часапісі, якія будуць практыкаваць масавае памнажэньне выданьня, трымацца апошняга указу Прэзыдыума Вярхоўнае Рады Беларусі, г.з. паведамляць дзе друкуецца, якім накладам, на якой паперы і г. д..